# «УСМЕШКА — ПАЦАЛУНАК ДУШЫ»



**Па гарызанталі: 1.** Пайшоў у ... — застаўся без сарочкі (прык.). **4.** Моцны і працяглы крык. **8.** «Самым шчаслівым смехам смяецца ...». Ж. Батай. **10.** «Смех — гэта ...: яно праганяе зіму з чалавечага твару». В. Гюго. **12.** Адна з народных назваў першага Спаса. **14.** «Іншыя смяюцца, каб паказаць свае прыгожыя ...». Ж. Ру. **16.** Духмяныя плады паўднёвага дрэва. **18.** «Як у вас, так і ў нас: // Сярод хаты ... . // Дзед бабу цалаваў, // Аж губамі плямкаў». Прыпеўка. **19.** «У баі — ... — героі, // А на гульні — хваты». З верша П. Броўкі «Хлопцы — каўпакоўцы». **20.** Калючы ёрш, ды ... з яго смачная (прык.). **21.** Скрынка для апускання выбарчых бюлетэняў. **22.** Вялікі гармонік. **23.** ... — першы шчасліўчык, таму што не меў цешчы (яўрэйская прык.). **25.** У старога каня і ... знімаюць (прык.). **31.** У выяўленчым мастацтве наклейванне на якую-небудзь аснову матэрыялаў другой фактуры. **33.** «... для чалавека тое ж самае, што водар для ружы». Д. Галсуорсі. **34.** Усмешка прыгожай жанчыны — ... кашалька (італьянская прык.). **35.** «Насмешка павінна кусаць, як авечка, а не як ...». Д. Бакачча. **36.** Прыбыцце поезда, парахода.

**Па вертыкалі: 1.** Дапамога прыйсці да рашэння. **2.** Гаспадар з хаты, а да жонкі ... багаты (прык.). **3.** Газаваны напітак. **5.** Паўднёвая расліна з ядомымі крухмалістымі клубнямі. **6.** Люлі, люлі, дзіця, спаць — ... маці, бацькоў пяць (прык.). **7.** Калі гаспадар з жонкай сварыцца, тады ў гаршку ... варыцца (прык.). **8.** «... і ў дзіравай кішэні не згубіцца». В. Сяргеечаў. **9.** Магчыма, ... разумнейшыя, чым куры, але яны хутчэй прыгатуюць (прык.). **11.** Ажыццяўленне задумы. **13.** «Усмешка — ... душы». М. Антрым. **15.** «Смех ёсць весялосць розуму, ... — весялосць сэрца». Браты Ганкур. **17.** Смех — ...: нададзьмуў, паіграў ды і кінуў (прык.). **22.** Вялікая шматвёславая лодка. **24.** Сталіца Іспаніі. **26.** Сорт яблыкаў. **27.** «І на вярбе растуць, часамі, бэры, // І па вядру ... дае, бывае, малака». З байкі К. Крапівы «Сваяўство». **28.** «Трыбух кажа: «Годзе!», а ... : «Яшчэ!» (прык.). **29.** ... пад плотам, а вяселле — потым (прык.). **30.** ... падоўжвае жыццё (прык.). **32.** На чужой старане і ... — мяса, і старая баба — маладзіца (прык.). **33.** Выпаленае месца ў лесе.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Прочкі. 4. Лямант. 8. Дзіця. 10. Сонца. 12. Мядовік. 14. Зубы. 16. Айва. 18. Ямка. 19. Арлы. 20. Юшка. 21. Урна. 22. Баян. 23. Адам. 25. Падковы. 31. Калаж. 33. Гумар. 34. Слёзы. 35. Сабака. 36. Прыход.

**Па вертыкалі:** 1. Падказ. 2. Кум. 3. Сітро. 5. Ямс. 6. Адна. 7. Траса. 8. Дуля. 9. Яйкі. 11. Выкананне. 13. Пацалунак. 15. Усмешка. 17. Вальнка. 22. Баркас. 24. Мадрыд. 26. Аніс. 27. Казёл. 28. Вочы. 29. Шлюб. 30. Смех. 32. Жук. 33. Гар.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.44 | 21.32 | 16.48 |
| Віцебск — | 4.25 | 21.30 | 17.05 |
| Магілёў — | 4.34 | 21.22 | 16.48 |
| Гомель — | 4.39 | 21.10 | 16.31 |
| Гродна — | 5.00 | 21.46 | 16.46 |
| Брэст — | 5.10 | 21.38 | 16.28 |

## Месяц

*Першая квадра ў 15.42.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

*Пр.* Дзмітрыя, Івана, Ігната, Карнілы, Мітрафана, Сяргея.
*К.* Магдалены, Кандрата, Якуба.



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 2 ЧЭРВЕНЯ

**1942** год — нарадзіўся (г. Краснаярск, Расія) Эдуард Васілевіч Малафееў, беларускі і савецкі спартсмен і трэнер (футбол), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі і СССР. У 1963—1972 гадах гуляў нападаючым у складзе мінскага «Дынама». З 1963 года выступаў у складзе зборнай каманды СССР, дзе адыграў 40 матчаў, забіў 6 мячоў. Бронзавы прызёр чэмпіянату свету (1966), сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы (1964). З'яўляўся галоўным трэнерам зборнай СССР (1984 — май 1986-га), якая выйграла адборачны турнір да чэмпіянату свету 1986 года. З 2000 па 2003 год Малафееў узначальваў зборную Беларусі па футболе. Менавіта пры Малафееве зборная дасягнула найлепшага выніку на гэты момант: у адборачным цыкле чэмпіянату свету — 2002 беларусы ледзь не выйшлі ў стыкавыя матчы, заняўшы трэцяе месца ў групе.



**1953** год — у лонданскім Вестмінстэрскім абацтве адбылася каранацыя Лізаветы II, каралевы Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Каранацыя Лізаветы II па яе патрабаванні была самай дэмакратычнай у гісторыі Брытаніі. Нягледзячы на пярэчанні прэм'ер-міністра Уінстана Чэрчыля і кіраўніцтва брытанскай царквы, яе паказалі па тэлебачанні. «Людзі павінны бачыць мяне, каб верыць мне», — так яна аргументавала сваё рашэнне.

**1955** год — дырэктывай Генеральнага штаба Узброеных сіл СССР быў сфарміраваны 5-ы Навукова-даследчы выпрабавальны палігон МА СССР. Цяпер касмадром Байканур (Рэспубліка Казахстан) — адзіны і найбуйнейшы ў Еўразіі касмадром.

**1962** год — 55 гадоў таму ў Навачаркаску адбыліся трагічныя падзеі, вядомыя таксама як «Навачаркаскі расстрэл». Пачатак трагічным падзеям паклалі два фактары. У канцы вясны 1962 года ў СССР выраслі цэны на малако і мяса. Для жыхароў гэтага горада новая харчовая праграма супала з паніжэннем заробкаў на электравозабудаўнічым заводзе — горадаўтваральным прадпрыемстве, дзе працавала палова дарослага насельніцтва. «На што нам жыць? Чым карміць свае сем'і?» — з такімі пытаннямі людзі прыйшлі да кіраўніцтва завода. Не атрымаўшы адказу, шматтысячная дэманстрацыя абураных працоўных з чырвонымі сцягамі і партрэтамі Леніна накіравалася ў цэнтр горада да будынка гаркама партыі. Адначасова туды ж былі скліканы нарад міліцыі і салдаты Навачаркаскага гарнізона. У паветра было дадзена некалькі аўтаматных чэргаў, і, страляючы ў паветра, аўтаматчыкі трапілі па дзецях, якія глядзелі на мітынг з дрэў. Пачалася паніка. Затым аўтаматны агонь быў перанесены на натоўп — на мірных безабаронных жыхароў. Праз некалькі хвілін на плошчы былі горы трупаў. Выступленне было задушана. Па афіцыйных даных, пры разгоне дэманстрацыі было забіта 26 чалавек, яшчэ 87 атрымалі раненні. Семярым «завадатарам» былі вынесены смяротныя прысуды, і яны былі расстраляныя, многія атрымалі працяглыя тэрміны пазбаўлення волі. Пасля распаду СССР усе асуджаныя былі рэабілітаваныя.

**1972** год — нарадзілася (в. Асечана Крупскага раёна) Кацярына Анатольеўна Карстэн, беларуская спартсменка (веславанне акадэмічнае), заслужаны майстар спорту Беларусі. Чэмпіёнка свету сярод юніёраў, чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў (1996, 2000), неадназаровая чэмпіёнка свету.

Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**
*«Мы ўсе жывём за кулісамі, а паказваем сябе на сцэне і нават гаворым заўсёды аб сцэне».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Пятніца — пяты дзень тыдня.**
**Апошні твой працоўны дзень і першы — у тваёй печані.**

Муж з жонкай. Яна:
— Заўтра да нас прыедзе мая мама.
Маўчанне.
— Ненадоўга, усяго на пару тыдняў.
Маўчанне.
— Ты чуў, што я сказала?
Маўчанне.
— Ну вось і слаўна, я ведала, што ты не разлуешся!
...Цяжкі ўздых.
— І не трэба на мяне крычаць!

**Як дастаць жанчыну.**
**1. Дачакайцеся, калі яна скончыць свой гадзінны падбор адзення і апранецца.**
**2. Спытайце: «Ты сур'ёзна ў гэтым пойдзеш?»**
**3. Бяжыце!**

Узлятае самалёт. У салон выходзіць сцюардэса:
— Паважаныя пасажыры! Вас вітае наша авіякампанія. Наш самалёт пілатуе пілот першага класа, заслужаны майстар парашутнага спорту...

**Учора бачыў прадуманую бойку: біліся проста каля ўваходу ў траўмапункт.**




Малюнак Алега ГУЦОЛА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2111.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 1 чэрвеня 2017 года.